Ігуменскі тракт
№ 19 (165)

■ Літаратурныя вандроўкі

# МЕСЦЫ СІЛЫ ЯДВІГІНА Ш.

## Які лёс напаткаў іх радавыя сядзібы?

**У якіх месцах лепш пісалася беларускім літаратурным класікам? Наколькі шчыльна яны былі звязаныя з зямлёй, на якой раслі, і што значыла для іх радзіма? Карэспандэнты «Звязды» звярнуліся да старшыні Беларускай асацыяцыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў Міколы ЧЫРСКАГА, каб разам убачыць літаратурную Беларусь. Ён прапанаваў нам найперш праехаць па Лагойшчыне і ўбачыць мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю знакавых беларускіх літаратараў Ядвігіна Ш. і Янкі Купалы. Аднак ці атрымаецца цэльная літаратурная вандроўка?**

Вязынку, радзіму Янкі Купалы, натуральна, па некалькі разоў наведаў кожны сумленны школьнік з суседняга Маладзечна. Бо мясціны там вельмі маляўнічыя і электрычка побач спыняецца, што зручна. Два гады таму ў пасёлку Ждановічы пад Мінскам запрацаваў музей-дача Васіля Быкава, што не можа не радаваць прыхільнікаў яго творчасці. «Звязда» актыўна падтрымлівае праект па адкрыцці музея Алеся Адамовіча ў вёсцы Глуша Бабруйскага раёна. Аднак гэта хутчэй кавалкі пазла літаратурнай Беларусі, якія пакуль што не складаюцца ў адно цэлае. Ці існуюць у нас распрацаваныя маршруты па месцах жыцця і дзейнасці літаратараў?

### Прывітанне ад дуба-дзядулі. Карпілаўка

Ядвігіна Ш. некаторыя даследчыкі называюць пачынальнікам беларускай прозы. Іншыя лічаць, што не ўсё так адназначна, але ў цэлым пагаджаюцца. Вёска Карпілаўка Лагойскага раёна – месца, дзе калісьці была радавая сядзіба пісьменніка.

Антон Іванавіч Лявіцкі (Ядвігін Ш.) жыў ва ўласным доме ў Карпілаўцы з 1896 года да 1921 года (пасля ён вымушаны быў перасяліцца ў Вільню).

Калісьці на ўчастку было шмат валуноў. Пісьменнік разам са сваім сынам узвальваў камяні на «калымажку» і вывозіў іх на ліпавую алею. Яны і сёння складным радком ляжаць ля былой сядзібы. Валуны пакрывае тоўсты слой моху — быццам сімвалізуе наслаенні часоў, што мінулі з даўняй пары.

Яшчэ адзін прыгажун гэтых месцаў — вялізны векавы дуб. Менавіта пра яго Ядвігін Ш. пісаў у сваім апавяданні «Дуб-дзядуля». Дрэва і сёння велічна ўзвышаецца над наваколлем. Праўда, у ім з'явілася выпаленае дупло — мясцовыя пастухі зрабілі яго, каб хавацца ў вялізнай адтуліне падчас дажджу. Аднак дрэва трымаецца, і сёння зеляннее кожным лісточкам.

Адразу перад уваходам на тэрыторыю сядзібы знаходзіцца не пашкоджаны дот часоў Першай сусветнай вайны. У 90-я гады мінулага стагоддзя была прапанова стварыць у ім музейную экспазіцыю, прысвечаную паэтам і пісьменнікам, якія загінулі ў час вайны. Аднак фінансавання ў той час не знайшлі, таму ідэя так і засталася нерэалізаванай. Дот стаіць і сёння: невялікі музейчык у ім сапраўды выглядаў бы арыгінальна.

Ад сядзібнага дома не засталося нічога, нават падмуркаў. Калі прайсці крыху далей, можна ўбачыць прыгожую крыніцу. Аднак тэрыторыя вакол яе не добраўпарадкавана — дабрацца будзе досыць складана.

Наведаўшы гэтае месца, з аднаго боку, радуешся, што ўбачыў прыгожыя валуны, раскладзеныя рукамі пісьменніка, і «жывога» дуба-дзядулю. Але з другога, задумваешся, чаму забыццё напаткала родны дом пачынальніка беларускай прозы?..



Чаму ж Ядвігін Ш.?.. Ёсць дзве версіі тлумачэння такога псеўданіма, і адна з іх не пярэчыць іншай. Як успаміналa дачка Антона Лявіцкага Ванда, у пісьменніка была любімая дзяўчына, якую звалі Ядвіга. І калі ён напісаў першае апавяданне і даслаў яго ў «Нашу ніву», то падпісаў яго «Ядвігін» і побач паставіў літару «Ш».

Згодна з другой версіяй, калі ён прыходзіў у Люцынку, да Дуніна-Марцінкевіча, то часта трапляў туды досыць позна, бо сядзіба знаходзілася на істотнай адлегласці. Аднойчы, калі пісьменнік прыйшоў і ўжо ў поцемках прабіраўся да ложка, нечакана ўзяўся за нагу дзяўчыны. Яна ўсклікнула: «Хто тут?!» Ён адгукнуўся: «Ядвіга, ша! Гэта я». І пасля менавіта так пачаў падпісваць свае творы.

Згадваю, яшчэ ў савецкія часы дыктарка тэлебачання, расказваючы пра пісьменніка, назвала яго Ядвігіным Трэцім. Атрымалася такая каламбурная памылка.

Мікола Чырскі расказаў, што ў Карпілаўцы пісьменнік пражыў досыць істотную частку свайго жыцця:

— Ядвігін Ш. значыць для беларускай літаратуры тое ж, што Чэхаў для — рускай. Нарадзіўся наш творца на Магілёўшчыне, потым бацькі пераехалі на Міншчыну, у Карпілаўку, пісьменнік апынуўся тут у дзесяцігадовым узросце. Ён пайшоў вучыцца ў Люцынку — пачатковую школу, арганізаваную Камілай, дачкой Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Пазней вучыўся ў Мінскай гімназіі, затым у Маскоўскім медыцынскім універсітэце. Але за ўдзел у хваляваннях студэнтаў быў схоплены і пасаджаны ў Бутырскую турму. Яго выключылі з універсітэта, медыцынскую адукацыю атрымаць так і не ўдалося. Лявіцкі вярнуўся на радзіму бацькоў у Карпілаўку, уладкаваўся працаваць правізарам у аптэку ў Радашковічах.

У госці да творцы любіў завітваць Янка Купала. 5 чэрвеня 1912 года менавіта тут пясняр упершыню прачытаў сваю п'есу «Паўлінка». Таксама тут бывалі Максім Багдановіч, Андрэй Александровіч і Язэп Лёсік, які быў зяцем Ядвігіна Ш.

### Калыска пасярод жытнёвага поля. Акопы

Літаральна ў кіламетры ад Карпілаўкі (калі ісці напрасткі ледзь прыкметнай сцежкай, што вядзе праз бярозавы гай) знаходзяцца Акопы — маляўнічае месца, якое называюць літаратурнай калыскай Янкі Купалы.

■ Фестывалім!

## КЛІЧА «БЕРАГІНЯ»

Вось ужо дзявяты раз з 23 па 26 чэрвеня гарадскі пасёлак Ацябрскі, што на Гомельшчыне, будзе прымаць аматараў народнай творчасці. На некалькі дзён невялічкі палескі гарадок ператворыцца ў адну вялікую святочную пляцоўку.

Сёлета ў фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» прыме ўдзел больш як 30 калектываў. На свята прыедуць прадстаўнікі не толькі абласцей Беларусі і горада Мінска, але і творчыя фальклорныя калектывы – госці з блізкага і далёкага замежжа. Гэта – дарослыя калектывы «Елізавецінцы», «Лазоры»(Расія), «ELEKTRO-PORCELAN» і «ZLATIBOR» (Сербія) і дзіцячыя фальклорны ансамблі «RADOSTI» (Чэхія), «Вяселікі» (Украіна), «Рэкетукас» (Літва), «Жэмэрва» (Польшча).

Аснова фестывалю – конкурсы і турніры танцавальных пар і калектываў, якія прадугледжваюць паказ абавязковай праграмы выступлення ў адпаведных інструментальных і танцавальна-спеўных намінацыях. А пераможцы фестывалю мінулых гадоў і замежныя гурты прадстаўяць гасцям свае канцэртныя праграмы. У праграме «Берагіні» – выстаўкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і прэзентацыя іх калектывамі, майстар-класы разам з нósьбітамі па танцах і спевах, ігранне на гармоніках, дэманстрацыя старажытных «адрэстаўраваных» строяў, паказ абрадаў, пляценне вянкоў... «Берагіня» стане сапраўдным сузор'ем талентаў, аб'яднаных настроем прыгажосці і натхнення.

**Людміла ВЫРВІЧ**

■ Дзеля памяці

# КАЛІ ДАКУМЕНТЫ ГАВОРАЦЬ

## Пабачыў свет зборнік архіўных матэрыялаў, прысвечаных лагеру смерці Трасцянец

**Амаль паўтысячы старонак, 255 дакументаў, мноства фотаздымкаў... Здаецца, кожная старонка новага зборніка «Трасцянец: трагедыя народаў Еўропы, памяць у Беларусі» прасякнута неверагодным болем. Болем тых, хто не выжыў у страшных лагеры смерці, тых, хто цудам здолеў уратавацца, але праз усё жыццё пранёс жахлівыя ўспаміны, тых, хто ў віхуры ваеннага ліхалецця страціў блізкіх. Вялікая Айчынная вайна пачалася 75 гадоў таму, але памяць пра страшныя часы яшчэ жыве ў сэрцах, а многія старонкі падзей тых часоў пакуль застаюцца невядомымі.**




Магчыма, некаторыя таямніцы раскрые зборнік «Трасцянец: трагедыя народаў Еўропы, памяць у Беларусі», што пабачыў свет у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

— Гэтая кніга мае вялікі сэнс. Яе змест неверагодна ўражвае, не трэба ніякіх пустых размоў, пераконвання. Дакументы кажуць самі за сябе, усялякія тлумачэнні і пераканання тут лішнія, — кажа **галоўны рэдактар выдавецтва «БелЭн імя П. Броўкі» Ларыса ЯЗЫКОВІЧ**. — Кніга будзе надзвычай карысная даследчыкам гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама студэнтам, выкладчыкам ды і ўсім беларусам. Само па сабе выданне робіць вельмі моцнае ўражанне. Назва зборніка не выпадковая, ён мае вялікае значэнне для нас, беларусаў, а таксама жыхароў іншых еўрапейскіх краін, якіх прывозілі ў Трасцянец, каб знішчыць...

І сапраўды, кніга «Трасцянец: трагедыя народаў Еўропы, памяць у Беларусі» цікавая не толькі беларусам, у гэтым страшным лагеры смерці знайшлі апошні прытулак многія жыхары Германіі, Аўстрыі, Чэхаславакіі, Польшчы. Сваякі ахвяр вельмі часта наведваюцца ў гэтыя мясціны, праяўляюць цікавасць да стварэння мемарыяла і нават дапамагаюць фінансава. Яны зацікаўленыя ў тым, каб гэтая тэма ўздымалася ў навуковых даследаваннях, каб вывучэнне гісторыі лагера смерці ў Трасцянцы было як мага больш шырокім. Але, на жаль, у беларускай гістарычнай навуцы пакуль не існуе ніводнага шырокага даследавання, прысвечанага Трасцянцу. Магчыма, з'яўленне вялікіх манаграфій на гэтую тэму яшчэ наперадзе.

**Галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь** і адзін са складальнікаў зборніка дакументаў **Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ** расказвае:

— Спадзяюся, што наш зборнік дакументаў падштурхне даследчыкаў да глыбокага вывучэння тэмы Трасцянца. Яшчэ шмат застаецца пытанняў без адказу: дакладна невядомая колькасць загінуўшых у гэтым лагеры смерці. Увесь час называюцца розныя лічбы, а для дакладнага вызначэння колькасці патрэбна яшчэ шмат працаваць. Справа ў тым, што ў 1943 годзе немцы, калі зразумелі, што давядзецца пакідаць акупаваныя тэрыторыі, пачалі хаваць сляды сваіх злачынстваў. Праводзілі раскопкі месцаў пахавання ахвяр і спальвалі трупы. Таму калі нашы даследчыкі пачалі вывучаць месца трагедыі, то амаль нічога акрамя попелу не знайшлі... Варта працягваць пошукі, бо нямецкія салдаты перыядычна адпраўлялі ў Берлін звесткі аб колькасці знішчаных трупаў. Магчыма, гэтыя дакументы яшчэ знойдуцца і дапамогуць раскрыць многія таямніцы Трасцянца.

Да тэмы Трасцянца Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь звяртаецца не ўпершыню. У 2003 годзе яго супрацоўнікі падрыхтавалі і выдалі зборнік дакументаў «Лагер смерці Трасцянец», куды ўвайшло больш як сто дакументаў. Але новая кніга вельмі істотна адрозніваецца ад папярэдняй.

— Тут мы звяртаем увагу не толькі на трагічныя падзеі ў Трасцянцы, але гаворым і пра ход мемарыялізацыі гэтага месца знішчэння людзей, — тлумачыць Вячаслаў Дзмітрыевіч. — Упершыню праз прызму дакументаў распавядаем пра тое, як ствараўся мемарыял у Трасцянцы. Акурат летась адбылося ўрачыстае адкрыццё першай часткі мемарыяла, але ж пытанне аб мемарыялізацыі Трасцянца паўстала адразу пасля вызвалення Беларусі ад акупантаў. Таксама значна пашырылася кола крыніц, якія мы ўводзім у навуковы абарот. Гэта не толькі дакументы з нашага архіва. Дзякуючы супрацоўніцтву з Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Ё. Рау мы атрымалі дакументы з архіваў Латвіі, Германіі, Расіі. Упершыню апублікаваныя некаторыя дакументы з архіва Камітэта дзяржбяспекі. Таксама тут можна пабачыць дакументы з крымінальных спраў на нямецкіх ваеннапалонных, якіх судзілі пасля вайны за ваенныя злачынствы. Гэта, у прыватнасці, сведчанні вадзіцеляў, якія працавалі на душагубках. Кніга таксама расказвае пра тое, як працавала камісія па выкрыцці злачынстваў гітлераўцаў.

Трасцянец — сапраўдны лагер смерці. Ён уключаў у сябе працоўны лагер з майстэрнямі, дзе працавалі вязні, а таксама урочышчы Шашкаўка і Благаўшчына — месцы масавага знішчэння людзей, якіх часам прывозілі з іншых лагераў смерці. Таму, безумоўна, чытаць новы зборнік, нават прагартаць яго і разглядаць фотаздымкі — справа не з простых. **Міхаіл НІКІЦІН, загадчык рэдакцыі гістарычных навук выдавецтва «БелЭн імя П. Броўкі»** гэта пацвярджае:

— Чытаць зборнік вельмі цяжка, тут шмат дакументаў, дзе падрабязна апісваюцца тэхналогіі масавага знішчэння людзей, шмат сведчанняў удзельнікаў злачынстваў, тых, хто цудам ацалеў, і тых, хто сам займаўся знішчэннем людзей. Пасля знаёмства з кнігай не застаецца ніякіх ілюзій пра тое, што нацызм мог даць нешта, акрамя зла і смерці. Напрошваецца вельмі важная выснова: у даследчыкаў, сучасных і будучых, яшчэ шмат працы па больш дакладным вывучэнні лагера смерці Трасцянец.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*